## ПРАФСАЮЗЫ — РЭАЛЬНАЯ СІЛА, ЗДОЛЬНАЯ ЗМАГАЦЦА ЗА ІНТАРЭСЫ ПРАЦОЎНЫХ

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са знамянальнай датай — 110-годдзем прафсаюзнага руху Беларусі.

Прафсаюзы заўсёды вырашалі задачы, прадыктаваныя жыццём. Ліквідацыя непісьменнасці, арганізацыя сацспаборніцтваў, мабілізацыя рабочых тылу ў часы ваеннага ліхалецця, адраджэнне разбуранай народнай гаспадаркі — толькі малая доля заслуг прафсаюзаў у савецкі час. Гэты адрэзак гісторыі адлюстраваў цэлую эпоху — ад стварэння невялікіх прафсаюзных арганізацый, якія дзейнічалі пасобку, да фарміравання Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Сёння ФПБ беражліва захоўвае і ўмацоўвае традыцыі слаўных працоўных подзвігаў, аб'ядноўваючы ў сваіх радах больш як чатыры мільёны чалавек. Яна з'яўляецца рэальнай сілай, здольнай змагацца за інтарэсы працоўных і быць верным саратнікам дзяржавы ў вырашэнні сацыяльных і эканамічных праблем.

У нашай краіне развіваецца сацыяльнае партнёрства, шырока выкарыстоўваецца калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін. Упэўнены, што аўтарытэт прафсаюзаў і надалей будзе расці, а колькасць добрых спраў на карысць Айчыны — памнажацца.

Зычу здароўя, новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту ўсім, хто сваёй працай уносіць пасільны ўклад у развіццё нашай дзяржавы.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

***

24 красавіка ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 110-годдзю прафсаюзнага руху Беларусі, у якім прыняў удзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ.

■ Парламенцкі дзённік

## АЗІЯЦКІ ВЕКТАР

**Адносіны Беларусі і Камбоджы ў апошнія гады развіваюцца больш інтэнсіўна. Пра гэта заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў учора падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Каралеўства Камбоджа Хун Сенам.**

Звяртаючыся да Хун Сена, спікер выказаў упэўненасць у тым, што цяперашні яго візіт адкрые новую старонку ва ўзаемадзеянні паміж дзвюма краінамі. «Беларусь праводзіць шматвектарную знешнюю палітыку, і мы асабліва зацікаўлены ў пашырэнні супрацоўніцтва з дзяржавамі ў Паўднёва-Усходняй Азіі. Камбоджа з'яўляецца для нас адным з важных партнёраў у гэтым рэгіёне,— падкрэсліў Анатоль Рубінаў.— У нашых краін ёсць узаемныя інтарэсы і няма ніякіх супярэчнасцяў. Мы з задавальненнем адзначаем, што ў апошнія гады адносіны паміж Беларуссю і Камбоджай пачалі развівацца больш інтэнсіўна».

Анатоль Рубінаў адзначыў, што 23 красавіка адбыліся перамовы Хун Сена з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам і прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам, па выніках якіх былі падпісаны важныя дакументы — шэсць дагавораў і тры мемарандумы аб паразуменні.

У сваю чаргу Хун Сен падзякаваў беларускаму боку за цёплы прыём і адзначыў падтрымку, якую камбаджыйская дэлегацыя атрымала падчас дыялогаў на розных узроўнях. Ён таксама звярнуў увагу на гатоўнасць Беларусі развіваць адносіны з Камбоджай па розных кірунках.

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Камбоджай усталяваны ў 1995 годзе. Па выніках 2013 года тавараабарот паміж краінамі склаў $6,3 млн і вырас амаль удвая да ўзроўню 2012-га. У студзені-лютым 2014 года тавараабарот перавысіў $1,4 млн (на 31,3% больш, чым за два месяцы 2013 года). Аснову беларускага экспарту летась склалі трактары. Акрамя таго, пастаўляліся трыкатажныя тканіны, запчасткі да аўтатрактарнай тэхнікі, вырабы з металаў, шыны, мэбля, прыборы і абсталяванне.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## СПЯКОТНАЯ ВЯСНА 86-га

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Рыхтаваліся да іх і заводы, бо перад імі ставілася задача максімальна хуткай пераарыентацыі выпуску мірнай прадукцыі на ваенную. Падрыхтаванасць іх перад пачаткам вучэнняў правяраў Штаб грамадзянскай абароны Савецкага Саюза.

— Мы ўжо рыхтаваліся сустракаць замежныя дэлегацыі, і тут раптам пачулі, што ва Украіне, на атамнай станцыі паблізу Чарнобыля здарылася нейкая аварыя,— працягвае Уладзімір Мурашка.— Што дакладна адбылося, не ведаў, аднак, ніхто. Падрыхтоўка да вучэнняў тут жа была рэзка спынена. А Штаб грамадзянскай абароны СССР накіраваўся ў размешчаны паблізу горад Прыпяць.

28 красавіка ў Гомельскай вобласці пачалі працу 24 санітарна-эпідэміялагічныя станцыі, 22 ветэрынарныя лабараторыі, 9 гідраметэастанцый і 664 пасты радыяцыйнага назірання. Нашу працу амаль кругласутачна каардынаваў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, начальнік Штаба грамадзянскай абароны БССР генерал-лейтэнант Аверкій Леанідавіч Грышагін. На вялікі жаль, падарожжа ў чарнобыльскае пекла скончылася для яго трагічна — ён моцна хварэў і адышоў у іншы свет у 1996 годзе…

Тады ж Штаб аддаў першае распараджэнне датычна арганізацыі і забеспячэння мер бяспекі для насельніцтва ў рэгіёнах, якія трапілі пад удар радыяцыі. Былі раздадзены сродкі індывідуальнай абароны, абмежавалі знаходжанне дзяцей па-за памяшканнямі, забаранілі ўжыванне малака і выкарыстанне адкрытых крыніц вады. Узнікалі пры гэтым і праблемы. На месцах нам неаднаразова прыходзілася чуць заявы кшталту: «Вы нам зрываеце пастаўкі мяса і малака!» Даводзілася чытаць чыноўнікам ледзьве не лекцыі па радыялогіі…

### Пінжак-ратаўнік

— Запомніўся выпадак, які адбыўся з міністрам аховы здароўя БССР Мікалаем Саўчанкам,— успамінае Уладзімір Мурашка.— У Чарнобыль ён паехаў у страшэнна дэфіцытным тады дарагім фінскім касцюме. На аператыўнай нарадзе, якая адбылася пасля чарговага рэйду па тэрыторыі, ён папрасіў аднаго з афіцэраў праверыць, колькі ж радыяцыі ўвабрала ў сябе печань. Шчупам вельмі адчувальнага прыбора, які выкарыстоўваўся ў геолагаразведцы, павадзілі ў вобласці печані. І бачым, як ва ўсіх дыяпазонах лічбы зашкальваюць. Колер твару міністра паступова стаў чымсьці падобным да колеру пінжака — такім жа сіне-зялёным. І тут нам усім рэзка стала не па сабе: атрымліваецца, што чалавек фактычна даведаўся аб смяротным прысудзе, які ўжо не абскардзіш у ніводнай інстанцыі…

Пасля некалькіх хвілін маўчання камусьці прыйшла ў галаву ідэя памераць выпраменьванне, зняўшы пінжак. На шчасце, прыбор паказаў велічыню ў межах нормы. Нямую сцэну перарваў вокліч Мікалая Яўсеевіча: «Ды дзе ж яшчэ я куплю сабе такі касцюм?!»

### «Як у нашай у старонцы нечакана выпаў стронцый…»

— Людзі эвакуяваліся з дамоў у страшэннай спешцы,— працягвае згадваць Уладзімір Мурашка.— Праз месяц я зайшоў у адзін з іх. На абедзенным стале стаялі сапсаваныя мясныя прадукты. У конаўках бялелі рэшткі скамянелага ад часу малака. Валяўся хлеб, на стале ляжалі мёртвыя мышы…

Вясна 1986-га была вельмі спякотнай. Слупок тэрмометра неаднойчы ўздымаўся да 28-градуснай адзнакі, а часам нават сягаў вышэй за яе. А дажджоў хранічна не хапала. У спешна адселеных вёсках засталося шмат свойскіх жывёл і птушак. Яны моцна пакутавалі ад смагі. А людзей, каб напаіць іх, там ужо не было. І неаднаразова даводзілася назіраць за тым, як курыца садзілася на край калодзежа і зрывалася ўніз, дзе яе вабіла вада. А назад, вядома, выбрацца птушка ўжо не магла.

У Магілёўскую вобласць мяне перакамандзіравалі на пачатку жніўня 1986 года. Тады мы прыехалі ў вёску Кармапайкі Краснапольскага раёна. У вёсцы гэтай стаяла школа, пабудаваная з лістоўніцы яшчэ за царскім часам. Гонта на ёй была вельмі старая, цяпер такую ўжо і не ўбачыш. І колькі мы гэтую школу ні дэзактывавалі, высокі ўзровень радыяцыі ў ёй працягваў захоўвацца. Вось так школа прастаяла дзве вайны, дзве рэвалюцыі, а нябачны вораг яе згубіў…

**Чарнобыльская станцыя мела шэраг істотных канструктыўных недахопаў. Частка труб была зроблена не з цырконію, а з легіраванай сталі. І гэтае свядомае парушэнне тэхналогіі пазней стала адным з фатальных.**

Запомніўся мне з гэтай школы кабінет прыродазнаўства. Гэта цяпер жывыя істоты намаляваны ў школьных падручніках. Тады ж існаваў дапаможнік наглядны — слоікі з заспіртаванымі жабамі, рыбамі, змеямі… І, што адметна, этыкеткі на слоіках былі напісаны на дарэформеннай рускай мове — з «яцямі» і «ерамі» пасля зычных на канцы слоў. Усе настаўнікі адтуль з'ехалі, застаўся ў школе толькі дырэктар. І мне запомніліся яго словы: «Я з гэтай школы не пайду, я ёй сваё жыццё прысвяціў»…



Руіны будынка рэактара.

Калі ў Гомельскай вобласці народ ставіўся да радыяцыйнай пагрозы больш сур'ёзна, то на Магілёўшчыне ўжо панаваў досыць разняволены настрой. Вып'юць увечары вясковыя жыхары традыцыйныя сто грамаў, сядуць на прызбе, пачынаюць іграць на гармоніку і спяваць прыпеўкі. Запомнілася мне адна з іх: «Як у нашай у старонцы нечакана выпаў стронцый». І нам кажуць: «Ай, ну што вы прычапіліся да нас з гэтай вашай радыяцыяй. Нам вунь немец нічога не зрабіў, і гэтую навалу перажывём».

— Існуе думка, што грамадзянская абарона падрыхтавана не была, што яна замоўчвала аб гэтых падзеях. Але гэта фактычна грубая падмена паняццяў. Калі ўявіць сабе, што сапраўды было так, дык хто ж удзельнічаў у работах па планаванні надзвычайных сітуацый? Хто аператыўна рушыў на ліквідацыю аварыі? Нават і цяпер, калі мінула ўжо 28 гадоў ад фатальнага выбуху, падзеі тых далёкіх часоў калі-нікалі праходзяць перад маімі вачыма, як кінастужка на запаволенай хуткасці…

Калі мы з вамі рыхтавалі гэты матэрыял, 4 красавіка з жыцця пайшоў мой сябар, адзін з першых ліквідатараў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, Уладзімір Міцкевіч. Радыяцыя літаральна з'ела яго лёгкія.

Наступствы чарнобыльскай катастрофы — гэта наша агульная бяда, з якой давядзецца жыць сотні гадоў. І таму вельмі важна не толькі памятаць пра падзеі, што з кожным днём усё далей адыходзяць у гісторыю, але і пра тых людзей, якія за барацьбу з радыяцыяй заплацілі сваім здароўем, а некаторыя — і жыццём. Таму што без іх удзелу наступствы аварыі былі б яшчэ горшымі для будучых пакаленняў…

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ПОШТА «НА КОЛАХ» НІКОЛІ НЕ СПАЗНЯЕЦЦА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Але ж на справе аказалася ўсё добра арганізавана. У пэўны час у вызначанае месца прыязджае машына, і людзі атрымліваюць карэспандэнцыю. Калі хто сам не можа прыйсці, яму дадому прывозяць тое, што было замоўлена: і фасаваныя прадукты харчавання, і мыйныя сродкі, і ручнікі, і бялізну, і хлеб. Людзям гэта вельмі падабаецца — асабліва тым, хто сталейшы.

**Старшыня Тонежскага сельсавета Лельчыцкага раёна Мікалай КУДЛАСЕВІЧ** увогуле здзіўляецца: калі ў вёсцы 18 чалавек жыве — як там можа быць стацыянарнае аддзяленне сувязі? Гэта ж немэтазгодна! Менавіта аддалены Лельчыцкі раён першым на Гомельшчыне і арганізоўваў работу паштовых машын-перасовак. Тэрыторыя раёна вельмі вялікая, а маленькія населеныя пункты раскіданы далёка адзін ад аднаго. **Начальнік Лельчыцкага раённага вузла паштовай сувязі Віталь МІЛІЧЭНКА** расказвае, што сістэму працы перасоўных аддзяленняў сувязі яны больш за 10 гадоў «абкатвалі» і сёння па іх раёне бегае пяць сініх машын, якія сталі прывычнымі для жыхароў невялічкіх вёсачак:

— Сёлета плануем яшчэ адну запусціць у вёскі, дзе будуць ліквідаваны стацыянарныя аддзяленні. Графік работы перасоўкі ў кожным населеным пункце на працягу месяца адпавядае сацыяльнаму стандарту — 5 разоў на тыдзень, акрамя нядзелі і панядзелка. А вось аказанне паслуг і дастаўка друкаваных выданняў могуць вар'іравацца ў залежнасці ад дзён выплаты пенсій, а таксама перыядычнасці выхаду газет і часопісаў. Бо дастаўка пошты для нас — святое.

Віталь Мікалаевіч адзначае, што арганізацыя такога віду абслугоўвання дапамагае вырашыць і праблему дэфіцыту кадраў на вёсцы. Тым больш што ў лельчукоў ёсць адна асаблівасць. Як пачынаецца цёплы сезон, многія адпраўляюцца на заробкі ў лес: у ягады і грыбы. На фоне «лясных зарплат» праца паштальёна не здаецца прыбытковай. Але тут, дзеліцца сваімі напрацоўкамі начальнік Лельчыцкай пошты, важна растлумачыць усе магчымасці і выгады работы ці то начальнікам перасоўнага аддзялення сувязі, ці то паштаркай:

— Працоўны дзень у паштальёна, які працуе звычайна на 0,5 стаўкі, пачынаецца тады, калі прыходзіць у вёску машына. Калі гэта, напрыклад, 11 гадзін, паштальён паспявае з самай раніцы лясныя дары назбіраць, а да вызначанага тэрміну быць на рабоце. Хутка даставіў пошту, тавары, пенсію — можна зноў ісці ў лес. Да таго ж, паштальён мае свой працэнт ад продажу тавараў, прэміяльныя таксама выплачваюцца. Такім чынам тыя, хто не лянуецца, могуць зарабіць неблагія грошы. Сёння ў нас усе перасоўныя пункты сувязі ўкамплектаваны кадрамі.

Дарэчы, вопыт арганізацыі паштовых перасовак мае яшчэ «савецкую гісторыю»,— расказвае **начальнік аддзела эксплуатацыі і бяспекі паштовай сувязі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Юрый ЛАПІЦКІ:**

— Мы пачыналі гэтую работу ў часы, калі яшчэ не так востра стаяла пытанне аптымізацыі сеткі і скарачэння стацыянарных аддзяленняў сувязі. Тады гэта рабілася для таго, каб наблізіць паслугі пошты да людзей у маланаселеных і аддаленых вёсках. Сёння ўсе разумеюць, што ўтрымліваць такую вялікую колькасць стацыянарных аддзяленняў пошце не па сілах. Летась на Гомельшчыне мы адкрылі чатыры перасоўныя аддзяленні сувязі. Ужо сёлета — у Чачэрску. Акрамя таго, аптымізавалі работу пошты на Нараўляншчыне. Сёлета плануем пусціць не менш за сем машын: у першую чаргу ў Хойніцкім і Брагінскім раёнах. Не выключана, што атрымаецца і ў іншых. Стацыянарныя аддзяленні сувязі мы закрываем толькі пасля таго, як параімся з насельніцтвам.

Сёння ва ўсіх раёнах Гомельскай вобласці — 41 аддзяленне сувязі на колах. Усе разам яны абслугоўваюць больш за 300 населеных пунктаў. Супрацоўнікі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» абяцаюць, што ні адна вёска не застанецца без паслуг паштовай сувязі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## ОАО «Амкодор-Белвар»

220005, г. Минск, проспект Независимости, 58

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**Собрание состоится 7 мая 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседаний Общества (корпус № 30, 3 этаж).**

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55. Орган, созывающий собрание: Совет директоров. Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 24 апреля 2014 года. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 25 апреля 2014 года.

**Повестка дня:**

1. О реорганизации ОАО «Амкодор-Белвар» в форме присоединения частного унитарного производственного предприятия «Амкодор-Квадранит».
2. О заключении договора о присоединении и наделении полномочиями на подписание договора о присоединении.
3. Об утверждении договора о присоединении.
4. Об утверждении передаточного акта.
5. О внесении дополнений в Устав ОАО «Амкодор-Белвар».
6. О выкупе акций ОАО «Амкодор-Белвар» по требованию его акционеров.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная со 2 мая 2014 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100363840 *Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар»*

В **суд Лидского района** поступило заявление об объявлении умершим САНКЕВИЧА Александра Викторовича, 14 декабря 1974 года рождения, уроженца г. Лиды Гродненской области, последнее известное место жительства: д. Бердовка, ул. Парковая, д. 8.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить суду Лидского р-на имеющиеся сведения о Санкевиче Александре Викторовиче в течение 2-х месяцев с момента опубликования объявления по тел.: 529760, 524441.

07 мая 2014 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

Повестка дня:

1. О совершении сделок Общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания: с 10.30 до 11.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 28.04.2014 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения Общества. Совет директоров. УНП 200251040

УНП 806000181.

## ГОДОВОЙ БАЛАНС общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2013 год

220007, г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14, тел./факс (017) 228-12-89, 228-12-90

(в млн. бел. руб.)

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2013 года | На 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | 1 508 | 859 |
| Запасы | 210 | 75 | 75 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 4 | 5 |
| Налог на добавленную стоимость пр приобретенным, товарам, работам, услугам | 240 | 158 | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 532 | 665 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 39 | 499 |
| **БАЛАНС** | **300** | **2 316** | **2 103** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2013 года** | **На 31 декабря 2012 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Уставный капитал | 410 | 7 | 7 |
| Добавочный капитал | 450 | 1 038 | 919 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 1 213 | 1 127 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 58 | 50 |
| **БАЛАНС** | | **2 316** | **2 103** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2013 год

(в млн. бел. руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За январь–декабрь 2013 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 2 318 | 1 746 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (358) | (611) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 1 960 | 1 135 |
| Управленческие расходы | 040 | (693) | (53) |
| Прибыль от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 1 267 | 1 082 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 7 | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (27) | (9) |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 1 247 | 1 073 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | 573 | 58 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 537 | - |
| проценты к получению | 103 | 33 | 56 |
| прочие доходы по инвестиц. деятельности | 104 | 3 | 2 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (611) | (4) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (609) | - |
| прочие расходы по инвестиц. деятельности | 112 | (2) | (4) |
| Прибыль от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | (38) | 54 |
| Прибыль до налогообложения | 160 | 1 209 | 1 127 |
| Чистая прибыль | 210 | 1 209 | 1 127 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | 220 | 119 | 188 |
| Совокупная прибыль | 240 | 1 328 | 1 315 |

Достоверность баланса и отчета о прибылях и убытках общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» подтверждена аудитором – индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной (свидетельство о гос.регистрации от 24.08.2000 г. № 955, выдано Минским горисполкомом, квалификационный аттестат аудитора № 0000077 от 01.10.2002 г., выдан Министерством финансов РБ).

Аудиторское мнение аудитора – индивидуального предпринимателя Ткач Светланы Ивановны:

«По моему мнению, прилагаемая к настоящему аудиторскому заключению бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «Форвард-Брокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Форвард-Брокер» на 1 января 2014 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 г., при этом совершенные ООО «Форвард-Брокер» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству».

Дата аудиторского заключения 25 февраля 2014 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 11 (по генплану) со встроенными помещениями и подземной автостоянкой**, опубликованную в газете «Звязда» 28 марта 2014 года.

Начало строительства жилого дома – август 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС — 3 ноября 2014 года.

Генеральный директор Н.В.Милошевский

*УНП 100071325*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЧСТУП «Цемекс» со снижением цены на 99%, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 309б:

| № лота | Наименование имущества | Стоимость имущества, выставленного на торги, рублей РБ | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона в размере 5% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100N» | 196 896 | 196 896 | 9 845 | 9 845 |
| 2 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100» | 191 744 | 191 744 | 9 587 | 9 587 |
| 3 | Установка для разгрузки сыпучих материалов | 369 289 | 369 289 | 18 465 | 18 465 |

Организатор торгов – **управляющий в деле о банкротстве ЧСТУП «Цемекс» Борейко Д.И.**

С имуществом (лотом) можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

*Задаток перечисляется до 08.05.2014 г. (включительно) по реквизитам для оплаты задатка: р/сч № 3012800000579 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Белгазпромбанк» Гомельская областная дирекция, МФО 153001742, УНП 490000841.*

Условия продажи – без условий.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

С предметом торгов можно ознакомиться по месту его нахождения в рабочие дни с 09.00 до 18.00.

С документацией, проектом договора и сметой затрат можно ознакомиться по месту нахождения организатора торгов в рабочие дни с 09.00 до 18.00.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

**Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 16.00 08.05.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области по предварительному согласованию по тел. 80296542561, 80447678805).**

**Дата, время, место проведения открытого аукциона 12.05.2014 года в 11.00, г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области).**

*Ранее было опубликовано извещение о проведении аукционных торгов в газете «Звязда» № 48 (27658) от 11.03.2014 г.*

**По вопросам ознакомления с имуществом (лотом) и участия в аукционе, приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 654-25-61; (8044) 767-88-05.**

## ЧПТУП «Пчелаут и М» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ЧПТУП «Пчелаут и М» со снижением цены на 85%

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток в размере 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **Здание детского сада с инв. № 310/С-22236 общей площадью 1059,0 кв.м, расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский р-н, Долголесский с/с, д. Долголесье, ул. Центральная, 58 а, расположенное на земельном участке, площадью 0,6486 га** | 103 455 900 | 10 345 590 |

Организатор торгов: **управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Продавец: **ЧПТУП «Пчелаут и М», 246050, г. Гомель, ул. 2-я Революционная, 8.**

*Задаток перечисляется до 08.05.2014 г. (включительно) на р/с № 3012540284017 в ЦКО № 2 дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, МФО 153001739, УНП 490556767.*

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 10% (10 345 590 рублей) от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 10 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 20 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

С предметом торгов можно ознакомиться по месту его нахождения в рабочие дни с 09.00 до 18.00.

С документацией, проектом договора и сметой затрат можно ознакомиться по месту нахождения организатора торгов в рабочие дни с 09.00 до 18.00.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, затраты на опубликование объявлений, в том числе на ранее назначаемые аукционы, возмещаются победителем торгов в течение 5-ти дней с даты подписания протокола о результатах торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

**Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00 08.05.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

**Дата, время, место проведения открытого аукциона: 12.05.2014 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

*Ранее было опубликовано извещение о проведении аукционных торгов в газете «Звязда» от 15.03.2014 г.*

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-044-767-88-05, тел.факс 8-0232-68-25-50. Дополнительная информация содержится на сайте www.disponent.by**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА Общества с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест»

«Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями административного, торгового значения и помещениями общественного назначения в д. Боровляны Минского района. Корректировка»

**Информация о застройщике:**

**Общество с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест»,** зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 14.05.2009 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191116618.

**Адрес:** 223016, Республика Беларусь, Минская область, Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Новый Двор, ул. Центральная, д. 18, пом. 18, к. 45.

**Режим работы:** пн.–пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

**Телефон/факс:** (017) 280 55 49.

**Генеральный подрядчик:**

ОДО «НОВОДОМ», свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации № 190591061, выданное решением Мингорисполкома от 23.12.2004 № 2642.

**Информация о проекте:**

**Цель проекта** – строительство группы многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями административного, торгового значения и помещениями общественного назначения в д. Боровляны Минского района.

Стоимость 1 м² жилых помещений составляет от 1050 долларов США.

Стоимость 1 м² нежилых помещений составляет от 950 долларов США.

Применяется гибкая система скидок.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м² считается действительной до момента опубликования новой декларации.

**Строительство жилых помещений осуществляется для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.**

**Начало строительства — ноябрь 2012 г.**

**Окончание строительства – I квартал 2014 г.**

**Местонахождение объекта долевого строительства:** Минский район, д. Боровляны, ул. Березовая роща.

**Архитектурно-планировочные решения:**

Здание 107-квартирного жилого дома, в том числе: однокомнатных – 54 ед., двухкомнатных – 32 ед., трехкомнатных – 21 ед., 4-этажное, состоит из 7-ми секций, протяженность здания – 155,72 м. На первом этаже расположены встроенные помещения: магазин непродовольственных товаров, офисные помещения. В подвале под всем зданием размещены офисные помещения, помещение товарищества собственников.

Площадь жилого здания – 10294 м². Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии).

**Встроенные помещения магазина:** общая площадь – 71,4 м².

**Офисные помещения:** общая площадь – 1632,9 м².

**Помещение товарищества собственников:** изолированное помещение с отдельным входом на первом этаже 3-й секции.

На крыше размещена крышная котельная.

Кровля – плоская рулонная с организационным внутренним водостоком.

Фундаменты дома – столбчатые из монолитного железобетона под отдельно стоящие колонны и монолитные ленточные под стены цоколя.

Железобетонные несущие стены приняты толщиной 200 мм.

Колонны – железобетонные монолитные, квадратного сечения с размерами 400х400 мм и прямоугольного сечения 300х800 мм.

Диски перекрытий – монолитные железобетонные.

Наружные самонесущие стены – из блоков ячеистого бетона толщиной 500 мм.

**Наружная отделка:**

Наружные стены – отделка наружных стен штукатуркой с покраской акриловой краской.

Цоколь – штукатурка с покраской фасадными красками по предварительно подготовленной поверхности.

**Застройщиком получены:**

экспертное заключение Дочернего республиканского унитарного предприятия «Госстройэкспертиза по Минской области» от 05.04.2013 № 495-70/13, дополнение от 11.04.2013 № 10-58;

решение Минского районного исполнительного комитета от 29.10.2012 № 7171 «О разрешении на строительство»;

разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по Минской области на производство строительно-монтажных работ от 29.01.2013 № 1-111Ж-893/12;

свидетельства о государственной регистрации земельных участков от 22.01.2013 г. № 600/991-7463, от 22.01.2012 № 600/991-7462.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков, осуществляющих строительство жилых помещений, после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, за исключением подвала, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков, осуществляющих строительство нежилых помещений, после ввода объекта в эксплуатацию: межэтажные лестничные клетки, лестницы, коридоры, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлтерской организации ОДО «Твоя столицаконсалт», г. Минск, ул. Шафарнянская, 11. Время работы: понедельник – пятница: 9.00–18.00, выходные: суббота, воскресенье, тел./факс: +375 (17) 286 37 27, моб.: +375 (29) 680 01 01, +375 (29) 771 01 01.**